# ПРАВЫ ШЛЯХТЫ Ў КАНТЭКСЦЕ ПАШЫРЭННЯ ІДЭАЛОГІІ САРМАТЫЗМУ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

**В. С. Станкевіч**

*lerika2003267@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік – Т. І. Доўнар, доктар юрыдычных навук, прафесар*

У артыкуле разглядаецца ідэалогія шляхецкага саслоўя – сарматызм. Шляхта, з'яўляючыся пануючым саслоўем у дзяржаве імкнулася ўсяляк абгрунтаваць сваё агульные пахожданне і набыць неабмежаваную колькасць правоў. Дзякуючы афармленню ідэалагічнай дактрыны залатой шляхейкай вольнасці, шляхта атрымала шмат ільгот і прывілеяў.

***Ключавыя словы:*** Вялікае Княства Літоўскае, шляхта, ідэалогія, ільготы, сарматызм.

У Рэчы Паспалітай шляхта з'яўлялася пануючым саслоўем. Яна прымала ўдзел у розных сферах жыцця: збіралася на соймы, прымала ўдзел у канфедэрацыях, рокашах, займала судовыя пасады і ўвогуле валодала амаль неабмежаванымі правамі [1]. Напрыклад, Радамская канстытуцыя 1505 г. адпаведна прынцыпу «nihil novi» (лат. нічога новага) гарантавала недатыкальнасць правоў і прывілеяў шляхецкага саслоўя [2]. Таму з'яўляючыся палітычнай элітай у дзяржаве, шляхта імкнулася зяцвердзіць сваю ўласную ідэалогію – так званы сарматызм.

Палажэнні сарматызма грунтаваліся на сярэднявечнай тэорыі аб сарматах як продках усходнеславянскіх народаў. Старажытна-грэчаскі вучоны Пталемей Еўрапейскую Сарматыю пазначаў на тэрыторыі ад Віслы да Дона, а Азіяцкую Сарматыю – на Усход да Дона. Таксама заходне-еўрапейскія гісторыкі VII – XII стст. атаясамлівалі з сарматамі некаторыя славянскія народы – чэхаў, палякаў, рускіх. У XVст. сармацкія погляды пачалі распаўсюджвацца на тэрыторыю Польшчы, а з канца XV ст. пад Сарматыяй пачалі разглядаць ўзе землі, падуладныя дынастыі Ягелонаў [2, с. 552].

Ян Длугаш сцвярджаў, што продкамі шляхты былі старажытныя сарматы, і XVI ст. умацавала гэтую легенду. Легенда абвяшчае, што ў старажытнасці рыцарскае племя сарматаў пакінула стэпы Прычарнамор'я, заваяваўшы тэрыторыі, дзе з часам павінна была быць створана Рэч Паспалітая. Захапіўшы гэтыя землі, сармацкія рыцары ператварылі карэннае насельніцтва ў рабоў, а самі ператварыліся ў шляхту. Толькі шляхта з'яўляецца выключным нашчадкам сарматаў, менавіта «нацыя», да якой павінна належаць аднаасобнае кіраўніцтва дзяржавай.

Значную ролю ў фарміраванні сармацкай ідэалогіі адыграла вялікае і стыхійнае паўстанне шляхты, якім стаў ракош Мікалая Зэбжыдоўскага, якое паглыбіла пачуццё яго нацыянальнай самасвядомасці па этнічнай прыкмеце, якая ўмацавала перакананасць у яго культурнай і палітычнай абвяшчэнні. перш за ўсё, якое замацавала ідэю шляхецкай вольнасці, стала фундаментальнай каштоўнасцю сармацкага светапогляду.

Шляхецкія вольнасці ўяўлялі культ павагі свабод кожнай асобы шляхецкага стану. Да такіх свабод належыла роўнасць усіх шляхціцаў перад законам, права на свабодную элекцыю караля, права кожнага шляхціца на свабоду голасу і права на пратэст, недатыкальнасць асобы шляхціца і яго маёнтка. П. Скарга называў залатую вольнсць «чертовой вольностью» і характарызаваў яе з самага адмоўнага боку [3, с.174].

Калі шляхта дамагалася пашырэння сваіх праў і свабод, яна мела на ўвазе зрабіцца незалежнай ад уплыва магнатэрыі і быць нароўні з імі ў прававым становішчы. Сапраўды шляхта ў прававым статусе была роўнай паміж сабой, але эканамічнае становішча было розным і таму яна ўсё роўна трапляла ў пэўную залежнасць ад буйных феадалаў. Асабліва гэта можна заўважыць на мясцовым узроўне, калі магнаты складалі ў паветах свае палітычныя групоўкі, а соймік апыняўся паслухмянай прыладай у руках моцных людзей. «Шляхта, – кажа ў адным месцы Скарга, – в простоте сердца сама не знает, что вокруг нее делается и криком на все соизволяет. Те, которые сами себя выбирают, или бывают выбраны по воле панов, вступают в свои выборные должности не с сердечным желанием добра Речи Посполитой, а с дурными желаниями» [3, с.174].

Увогуле шляхецкая ідэалогія грунтавалася на наступных палажэннях: агульнае паходжанне шляхты, экзекуцыйная праграма, тэорыя шляхецтва, надасканалейшая forma mixta, сармацкі каталіцызм, патрыятызм [4]. Экзекуцыйная праграма патрабавала вяртання шляхце тых правоў, якія быццам бы незаконна адабрала каралеўская ўлада, або прыўласціла магнатэрыя. Тэорыя шляхецтва будавалася як на «натуральным», так і «звышнатуральным» падмурках. У адпаведнасці з першым, вызначальнае значэнне мела канцэпцыя «прыроджанай высакароднасці», згодна з якой высокая сацыяльная карыснасць шляхецтва вынікае са значнасці крыві, «высакароднасці» паходжання. Сфарміраваўся прынцып: чым больш высакародныя продкі, тым лепш

Шляхта лічыла найлепшай формай дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай змешаную форму кіравання (канцэпцыя Арыстоцеля) якая гарантавала росквіт свабоды, а да новых ідэй і рэформ ставілася балюча [5, с.126]. Ідэалам сарматызма лічыўся шляхціц-католік, які ў мірны час займаецца гаспадаркай, а ў ваенны – выступае як ваяр [4, с.553].

Абагульняючы сказанае вышэй, можна зрабіць выснову, што шляхта, якая з’яўлялася пануючым саслоўем, мела сваю ўласную ідэалогію – сарматызм, якая разглядалася яе ідэолагамі праз веру ў абранасць нашчадкаў сармацкага этнасу. Менавіта сарматызм з’яўляўся адной з падстаў фарміравання агульнага шляхецкага светапогляду.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Станкевіч, В.С.* Палітычныя правы шляхты Вялікага Княства Літоўскага. Сборник научных статей студентов, магистрантов, аспирантов. Выпуск 28. Минск : “Четыре четверти”, 2022. С. 218-219.
2. *Доўнар, Т.І.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. – 416 с.
3. *Довнар-Запольский, М.В.* История Беларуси. 4-е изд. Минск : Беларусь, 2016. 591 с. : ил.
4. *Шчэрбік, Д. В.* // Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : вучэбна-метадычны комплекс. Наваполацк, ПДУ, 2009. 352 с.
5. *Пазднякоў, В.* Сарматызм. Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. У 2 т. Т.2: Кадэцкі корпус Яцкевіч / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. Мн.: БелЭн, 2006. с. 552-553.